*Ю.В. КІРЧУК*

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПА ТЭМЕ АДНАЎЛЕННЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ І ТРАНСПАРТУ БЕЛАРУСІ (СЯРЭДЗІНА 1943 – СЯРЭДЗІНА 1950-х гг.): ЭТАПЫ, ПРАБЛЕМЫ, ПАДЫХОДЫ

Анализируется развитие отечественной историографии восстановления и развития промышленности, транспорта Беларуси в первые послевоенные годы. Обосновывается, что по данной теме в историографии можно выделить 4 периода. Подчеркивается, что при всей многогранности научных трудов по проблемам минувшей войны данная тема не стала предметом специального исследования. Оценивая состояние научной разработки вопросов восстановления народного хозяйства Беларуси в первые послевоенные годы, отмечается, что в целом историки проделали значительный труд по изучению этой проблемы.

The article deals with thorough analysis of the development of historiography of restoration and growth of industry and transport in Belarus during the early post-war years. It has been proved that there are 4 periods in the historiography on this issue. The emphasis is made on the point, that in spite of multisided scientific studies on the issues of past war the problem of restoration of national economy of Belarus during the early post-war years hasn't become the subject of specific investigation. Evaluating the status of the scientific development of this pending issue, it has been posed, that the historians have made a considerable study of this problem.

Тэма аднаўлення народнай гаспадаркі, у першую чаргу прамысловасці і транспарту, знайшла сваё адлюстраванне ў даследаваннях гісторыкаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны і першых пасляваенных гадоў. Стан навуковай распрацоўкі праблемы гістарыяграфіі па разглядаемай тэме ў цэлым не адпавядае ўзроўню вывучэння Вялікай Айчыннай вайны. Асноўную частку публікацый складаюць гістарыяграфічныя даследаванні, якія прысвечаны гісторыі аднаўлення савецкай эканомікі ў ваенныя гады[1]. Да пытанняў гістарыяграфічнага аналізу літаратуры аб працы насельніцтва Беларусі ў савецкім тыле і пасля выгнання захопнікаў звяртаецца Кнацько Г.Дз.[2] У цяперашні час вылучаецца неабходнасць пашырэння гістарыяграфічнага, крыніцазнаўчага аналізу літаратуры пасляваеннага аднаўлення і відавочна запатрабаванасць у глыбокіх, узважаных меркаваннях і адзнаках.

Аналізуючы развіццё гістарыяграфіі, ступень распрацоўкі тэмы аднаўлення прамысловасці і транспарту Беларусі ў першыя пасляваенныя гады, трэба адзначыць дысертацыйныя працы, якія маюць непасрэдныя адносіны да даследуемай тэмы. Большая колькасць работ, што закранаюць тэму, напісана ў асноўным у 1950–1960-я гг.[3] Сярод прац, якія напісаны ў 1970–1980-я гг., варта адзначыць дысертацыі Г.І. Аляхновіч, Л.А. Міхайлоўскага, М.І Скрыннікава, Н.А. Ярмоленка і інш.[4] Пачынаючы з 1990-х гг., не з'яўлялася абагульняючых работ, прысвечаных тэме пасляваеннага аднаўлення прамысловасці і транспарту Беларусі. У гэты перыяд даследуюцца такія аспекты тэмы, як утрыманне і працоўнае выкарыстанне ваеннапалонных і інтэрніраваных на тэрыторыі Беларусі (1944–1951), сялянства на вызваленай тэрыторыі БССР (1941–1945) і інш.[5] У цяперашні час вылучаецца неабходнасць комплекснага даследавання праблемы, якое ўключала б у сябе эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя аспекты.

У рамках дадзенага артыкула мэтазгодна правесці гістарыяграфічны агляд літаратуры, якая ёсць на сённяшні дзень па тэме пасляваеннага аднаўлення прамысловасці і транспарту Беларусі, паказаць логіку яе вывучэння і дасягнутыя рубяжы.

На працягу 1945–1955 гг. айчынная гістарычная навука зрабіла толькі некаторыя крокі наперад у асвятленні важных пытанняў гісторыі перыяду мінулай вайны. Буйныя працы пра шматгранны працэс аднаўлення адсутнічалі. Круг архіўных крыніц, якія знаходзіліся ў распараджэнні даследчыкаў, быў вельмі вузкі ў выніку шэрагу прычын. У першую чаргу таму, што гэтыя архівы былі яшчэ не ўкамплектаваны. У гістарычных працах гэтага перыяду мелі месца апісальны падыход да падзей, выкарыстанне матэрыялаў бягучых архіваў. Асобая ўвага надавалася кнізе старшыні Дзяржплана СССР М.А. Вазнясенскага[6]. У гэтай першай абагульняючай працы пра ваенную эканоміку СССР быў зроблены буйны крок наперад у распрацоўцы разглядаемых праблем, уводзілася ў зварот шмат новых звестак. Значная яе частка прысвечана аднаўленню гаспадаркі падчас вайны. Матэрыялы аб маштабах і тэмпах аднаўленчых работ, якія характарызуюць уклад вызваленых раёнаў у эканоміку краіны, змяшчае кніга Л. Валадарскага[7]. Для першага перыяду гістарыяграфіі было характэрна з'яўленне артыкулаў, брашур і кніг, напісаных непасрэднымі ўдзельнікамі аднаўленчага працэсу, партыйнымі, савецкімі і камсамольскімі работнікамі[8]. Выйшлі ў свет публікацыі, аўтары якіх каменціравалі афіцыйныя дакументы. У строгім сэнсе слова гэтыя працы не з'яўляліся навуковымі і насілі галоўным чынам публіцыстычны характар. Глыбокага аналізу ўсяго спектра праблем аднаўлення і развіцця прамысловасці, транспарту Беларусі ў першыя пасляваенныя гады не было. Гэтыя выданні, у якіх было заяўлена аб галоўных праблемах, шляхах іх пераадолення, хуткім і паспяховым аднаўленні, сталі першым вопытам гістарыяграфіі дадзенай тэмы.

Новы этап у развіцці гістарыяграфіі, які пачаўся з сярэдзіны 1950-х гг., быў абумоўлены неабходнасцю атрымання аб'ектыўнай інфармацыі аб становішчы спраў у народнай гаспадарцы, патрабаваннем у вывучэнні праблем нядаўняга мінулага, значным пашырэннем кола крыніц. У 1950-х гг. у асноўным завяршылася масавая перадача ў архівы дакументаў і матэрыялаў ваенных часоў. У гэты перыяд прасочваецца імкненне аўтараў глыбей і больш крытычна асэнсаваць ранейшыя ацэнкі аднаўлення і развіцця прамысловасці. Апублікаваны працы, якія раскрывалі маштабы разбурэнняў і фашысцкага рабавання, усенародныя намаганні па адраджэнню вызваленых тэрыторый, нармалізацыі жыцця ў раёнах рэспублікі[9]. У гэты перыяд тэма аднаўлення заняла важнае месца ў манаграфіях, калектыўных працах і артыкулах гісторыкаў, якія шырока выкарыстоўвалі цэнтральныя, мясцовыя і партыйныя архівы. Гэта не азначала, што сталі даступнымі важнейшыя звесткі аб жыцці краіны ваенных гадоў і пасляваеннага часу. Недастаткова даставернай была афіцыйная інфармацыя, а публікацыя многіх важных для даследчыкаў эканамічных даных была забаронена. У гэты перыяд з'яўляецца група работ, дзе галоўная ўвага ўдзяляецца адлюстраванню гераізму рабочага класа. У адрозненне ад папярэдняга перыяду, калі пераважалі працы эканамістаў, вырасла колькасць публікацый гісторыкаў. Так, пытанні развіцця народнай гаспадаркі і матэрыяльнага дабрабыту, характарыстыка ўкладу эвакуіраванага з Беларусі насельніцтва ў эканамічны патэнцыял краіны ваеннага часу змяшчаюцца ў абагульняючай навуковай працы «Экономика Советской Белоруссии 1917–1967 гг.»[10]. Звесткі аб пасляваенным аднаўленні народнай гаспадаркі змяшчае кніга «Экономическая история БССР»[11]. Адначасова ў даследаваннях дадзенага перыяду адбыўся частковы зварот да палажэнняў, якія былі характэрны для першага пасляваеннага дзесяцігоддзя.

Розныя аспекты развіцця эканомікі Беларусі ва ўмовах ваеннага часу і першых пасляваенных гадоў знайшлі адлюстраванне ў манаграфічных даследаваннях 1970–1980-х гг. Г.І. Аляхновіч Г.П. Купрэевай, Л.М. Лыча, І.Я. Марчанка. У гэты ж перыяд апублікаваны спецыяльныя зборнікі, прысвечаныя абагульненню вопыту аднаўлення розных галін прамысловасці[12]. Яны ўтрымліваюць шмат даных аб маштабах разбурэнняў, аб'ёме аднаўленчых работ. Кажучы пра пашырэнне праблематыкі ў дачыненні да 1970-х гг., варта адзначыць характэрную для гэтага этапу развіцця гістарыяграфіі тэндэнцыю да паглыблення гісторыка-эканамічных даследаванняў. Падрабязна пытанні аднаўлення народнай гаспадаркі рэспублікі разглядаюцца ў чацвёртым і пятым тамах «Гісторыі Беларускай ССР»[13]. Аўтары дэталёва асвяцілі працоўны энтузіязм беларускага народа, уклад дапамогі савецкіх рэспублік у перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі.

Комплексна пытанні аднаўлення народнай гаспадаркі Беларусі ва ўмовах вайны тлумачацца ў артыкулах і манаграфіях Г.П. Купрэевай[14]. Даследчыца прыводзіць даныя, як у кароткія тэрміны з руін узнімаліся заводы і фабрыкі, наладжваўся выпуск прамысловай прадукцыі, аднаўлялася работа транспарту. Аўтар надае вялікую ўвагу асвятленню тэмы матэрыяльнага забеспячэння насельніцтва пасля выгнання акупантаў за межы рэспублікі. Адзначаецца, што аднаўленне прамысловасці было здзейснена за лік унутраных сродкаў і за кошт дапамогі саюзных рэспублік. У цэлым шматпланавыя даследаванні Г.П. Купрэевай з'яўляюцца каштоўным укладам у распрацоўку праблем развіцця прамысловасці Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

У гэты час зроблены спробы ў накірунку вывучэння гісторыі транспарту. Пытанні працоўных дасягненняў беларускіх чыгуначнікаў у пасляваенны перыяд даследуе ў сваёй манаграфіі Л.М. Лыч[15].

Шмат месца ў ёй адводзіцца вывучэнню развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы, удасканалення арганізацыйнай структуры кіравання транспартам, росту творчай актыўнасці, падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў. Акрамя таго, у перыядычным друку знайшла сваё адлюстраванне тэма працы чыгуначнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны[16].

Значную цікавасць у гістарыяграфіі праблемы ўяўляе айчынная манаграфія, прысвечаная аналізу «чалавечага фактару» ў аднаўленні народнай гаспадаркі Беларусі. На багатым фактычным матэрыяле адлюстраваны поспехі ў аднаўленні прамысловасці і транспарту, іх тэхнічнай рэканструкцыі, збудаванні новых заводаў і фабрык у манаграфіі І.Я. Марчанка[17]. Асаблівая ўвага ў працы ўдзяляецца раскрыццю дзейнасці партыйных арганізацый па развіццю працоўнай і палітычнай актыўнасці працоўных, масавага сацыялістычнага спаборніцтва, руху наватараў вытворчасці, адлюстраваны колькасныя і якасныя змены працоўнага класа.

Выкарыстоўваючы шырокае кола крыніц, даследаванне эканомікі Беларусі ва ўмовах Вялікай Айчыннай вайны ажыццявіла Г.І. Аляхновіч[18]. Для вывучэння дадзенай тэмы асаблівую цікавасць прадстаўляюць звесткі аўтара аб эканамічных перадумовах аднаўлення рэспублікі, фарміраванні матэрыяльнай базы. Даследчыца раскрыла ўмовы дзейнасці прадукцыйных сіл Беларусі ў складзе ваеннай гаспадаркі на апошнім этапе вайны.

Усе публікацыі аб аднаўленні і развіцці прамысловасці і транспарту Беларусі ў першыя пасляваенныя гады выкананы ў духу канцэпцыі даследчай работы таго часу. Яны адлюстроўваюць дасягненні народа па розных накірунках дзейнасці і практычна не ўтрымліваюць крытычнага аналізу.

У 1980-я гг. прыкметна прасунулася вывучэнне гісторыі аднаўлення індустрыі Беларусі пасляваеннага часу. Распачатая ў 1985 г. перабудова прад'явіла іншыя патрабаванні да гістарычнай навукі, да вывучэння гістарычнага вопыту. У гэты перыяд істотна павялічыўся навуковы ўзровень прац, прыкметна пашырыўся спектр разглядаемых праблем. У навуковы зварот былі ўведзены матэрыялы друку, успамінаў. Аднак колькасны рост аб'ёмаў дакументальных матэрыялаў у працах даследчыкаў не заўсёды суправаджаўся якаснымі зменамі, не мянялася іх інтэрпрэтацыя. Вучоныя ў асноўным выкарыстоўвалі дырэктыўныя матэрыялы партыйных і дзяржаўных архіваў, абагульненыя статыстычныя даныя. Аналіз гістарычнай рэчаіснасці падмяняўся аналізам рашэнняў органаў улады і кіравання. Размова ішла не столькі аб здзейсненых, колькі аб плануемых дзеяннях.

З пачатку 1990-х гг. гістарыяграфія даследуемай праблемы паступова ўваходзіць у новы перыяд. Гэта тлумачыцца тым, што адбыліся кардынальныя змены палітычнай сітуацыі ў краіне, пераацэньваліся шматлікія факты і падзеі. Значна ўзраслі магчымасці для далейшага вывучэння ўсіх праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У канцы 1990-х – сярэдзіне 2000-х гг. бесперапынна пашыралася колькасць і паляпшалася якасць даследаванняў.

Гістарыяграфія ў гэты перыяд папоўнілася навуковымі працамі па эканамічнай гісторыі Беларусі, дзе былі перагледжаны погляды на гісторыю народнай гаспадаркі Беларусі, пераасэнсаваны шматлікія палажэнні і вывады, якія панавалі ў гісторыка-эканамічнай навуцы і не вытрымалі выпрабавання часам[19].

У другой палове 1990-х гг. у сувязі з большай даступнасцю закрытых раней архіўных матэрыялаў павялічылася ўвага да праблемы выкарыстання працы ваеннапалонных публіцыстаў, навукоўцаў, у тым ліку ў сувязі з ростам цікавасці да лёсу рэпрэсіраваных. У 2000-я гг. працы, прысвечаныя гісторыі сістэмы лагераў і спецпасяленняў, праблеме выкарыстання прымусовай працы ў БССР у 1930–1950-х гг., сталі з'яўляцца ў друку. Асобую групу даследаванняў складаюць працы А.В. Шаркова[20]. Аўтар даследуе праблемы ваеннапалонных, іх прававы стан, дзейнасць сістэмы лагераў ГУПВІ на тэрыторыі Беларусі. Разглядаецца гэта праблема не толькі ў гістарычным, а і ў прававым аспекце. Спасылаецца аўтар на крыніцы з архіваў МУС і КДБ Рэспублікі Беларусь, дакументы з НАРБ, якія раней не публікаваліся. Пачалася публікацыя раней невядомых дакументаў на лагерную тэму, у тым ліку статыстычныя звесткі пра колькасць і склад зняволеных Германіі і яе саюзнікаў у савецкім палоне, пра прававыя асновы палону, гаспадарчай дзейнасці ў асобных падраздзяленнях, лагерах, пра выкарыстанне прымусовай працы і г. д.[21] Арганізацыі працы нямецкіх ваеннапалонных на прадпрыемствах і будоўлях Беларусі прысвечаны артыкул А.І. Гладкевіча[22].

Тэму «Беларусь і ЮНРРА» асвяціў у сваёй манаграфіі У.Е. Снапкоўскі[23]. Аўтарам даследавана гісторыя заключэння і рэалізацыі дамовы паміж кіраўніцтвам БССР і ЮНРРА, дзейнасць дзяржаўных органаў рэспублікі і місіі ЮНРРА па выкананні праграм дапамогі Беларусі. Цікавыя звесткі аб дзейнасці Адміністрацыі ААН па аказанні дапамогі і рэабілітацыі змяшчае артыкул А. Вялікага[24].

Шэраг публікацый аб ролі германскіх рэпарацый у аднаўленні народнай гаспадаркі Беларусі прысвяціла Г.П. Бушчык[25]. На падставе шырокага кола крыніц, большая частка якіх была ўведзена ў навуковы ўжытак упершыню, даследчыца падкрэслівае, што рэпарацыі паступалі ў БССР у выглядзе прамысловага абсталявання, транспартных сродкаў і г. д. Падрабязна асвятляецца камплектаванне рэпарацыйным абсталяваннем розных фабрык і заводаў.

Аднаўленне і развіццё транспарту Беларусі пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны не стала аб'ектам грунтоўнага і шматграннага гісторыка-эканамічнага вывучэння. Навуковыя даследаванні

ахопліваюць празмерна вялікія адрэзкі часу або апавядаюць пра развіццё не ўсяго транспарту, а яго асобных відаў[26]. Апублікаваны шэраг папулярных брашур, галоўным чынам прымеркаваных да юбілейных дат. Пытанні гісторыі развіцця транспарту Беларусі адлюстроўваюцца ў асобных раздзелах калектыўнай працы «История транспорта»[27]. З'яўляюцца артыкулы, прысвечаныя падбору, падрыхтоўцы і камплектацыі кадраў чыгуначнікаў на беларускіх магістралях пасля Вялікай Айчыннай вайны[28].

Акрамя таго, важныя звесткі аб аднаўленні народнай гаспадаркі рэспублікі змяшчаюцца ў сацыяльна-эканамічных нарысах гісторыі асобных прадпрыемстваў[29], населеных пунктаў і абласцей[30].

У 1990-х гг. вопыт савецкай гістарыяграфіі пасляваеннага перыяду стаў крытычна пераацэньвацца. Істотна пашырылася кола крыніц навуковых даследаванняў дзякуючы больш шырокаму доступу вучоных у архівы. У сучаснай гістарыяграфіі захоўваюцца некаторыя стэрэатыпы. Шматлікія працы, якія прысвечаны аднаўленню эканомікі ў гады вайны і пасляваенны перыяд, як правіла, насычаны вялікай колькасцю лічбаў, тэкстуальна перадаюць дакументы партыйных камітэтаў канстатавальнага характару. Не заўсёды адбор, ацэнка найбольш важнай інфармацыі суправаджаюцца неабходным навуковым аналізам і атрыманнем новых абагульненняў, вынікаў, якіх не было ў крыніцах.

Аналіз развіцця айчыннай гістарыяграфіі тэмы дазваляе фармуляваць вывад аб наяўнасці ў ёй двух накірункаў. Для першага характэрна рашэнне перш за ўсё навуковых задач. Вялікі ўплыў на яго аказваў стан дакументальнай базы, у ім у большай меры прысутнічала пераемнасць у развіцці гістарыяграфіі. У другім накірунку пераважалі палітычныя прыярытэты. Палітычна-ідэалагічнае ўздзеянне вызначала характар вырашэння даследчых задач. Абодва гэтыя накірункі існавалі не ізалявана, а ўзаемадзейнічалі.

Такім чынам, на сучасны момант у развіцці айчыннай гістарыяграфіі аднаўлення і развіцця прамысловасці і транспарту Беларусі ў першыя пасляваенныя гады можна выдзеліць 4 перыяды: першы ахоплівае гады вайны і першае пасляваеннае дзесяцігоддзе; другі – з сярэдзіны 1950-х да пачатку 1970-х гг.; трэці – з пачатку 1970-х да канца 1980-х гг.; чацвёрты перыяд – з пачатку 1990-х гг. па цяперашні час. Кожны з іх характарызуецца вызначаным колам распрацоўваемых праблем, станам дакументальнай базы, маштабамі даследавання, узроўнем навуковых абагульненняў, відамі публікацый, нясе ў сабе характарыстыкі, якія звязаны са становішчам грамадства, палітычнымі зменамі, адлюстроўвае працэс развіцця навукі. У аснове перыядызацыі ляжыць сукупнасць такіх крытэрыяў, як стан крыніц па праблеме, узровень арганізацыі навуковых прац і ўплыў на ход яе вывучэння аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў.

Агульны аналіз ступені распрацаванасці тэмы даследавання ў літаратуры паказвае, што пры ўсёй шматграннасці навуковых прац па праблемах мінулай вайны гістарыяграфія аднаўлення народнай гаспадаркі не стала прадметам спецыяльнага даследавання айчынных гісторыкаў. Аднак, ацэньваючы стан навуковай распрацоўкі даследуемай праблемы, неабходна адзначыць, што ў цэлым гісторыкі прарабілі значную працу па вывучэнні пасляваеннага аднаўлення Беларусі. Разам з тым распрацоўка дадзенай тэматыкі ўсё яшчэ далёкая да завяршэння.

[1] Гл.: Ежов В.А. Проблема возрождения освобожденных и прифронтовых районов СССР в период Великой Отечественной войны в советской историографии // Возрождение прифронтовых и освобожденных районов СССР в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. М., 1986. С. 182–197; Историография советского тыла периода Великой Отечественной войны. М., 1976; Пянкевич В.Л. Возрождение советской экономики в годы Великой Отечественной войны. СПб., 1999; Ён жа. Репарации и труд военнопленных как источники восстановления экономики СССР после Второй мировой войны. СПб., 1999.

[2] Гл.: Кнацько Г.Дз. Праца насельніцтва Беларусі ў савецкім тыле і пасля выгнання захопнікаў // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. Мн., 1999. С. 210–223.

[3] Гл.: Колышкин А.И. Развитие промышленности Белоруссии в послевоенный период (1946–1960): Дис. … канд. экон. наук. М., 1958; Кудряшов В.С. Развитие машиностроительной промышленности БССР в послевоенный период (1946–1955): Дис. … канд. ист. наук. М., 1958; Марченко И.Е. Промышленность и рабочий класс Советской Белоруссии в годы восстановления и дальнейшего развития народного хозяйства (1943–1950): Дис. … д-ра ист. наук. Мн., 1967; Пейсахович А.Я. Борьба трудящихся Белорусской ССР за восстановление народного хозяйства республики в годы Великой Отечественной войны (1943–1945): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 1962.

[4] Гл.: Ермоленко Н.А. Деятельность Компартии Белоруссии по восстановлению и дальнейшему развитию легкой промышленности республики в 1944–1950 гг.: Дис. … канд. ист. наук. Мн., 1976; Михайловский Л.А. Борьба трудящихся Минска за восстановление и дальнейшее развитие промышленности города (июль 1944–1950): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 1971; Олехнович Г.И. Народное хозяйство Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны 1941–1945 гг.: анализ экон. процессов: Дис. … д-ра ист. наук. М., 1980; Скринников М.И. Железнодорожники Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1945): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 1980.

[5] Гл.: Тимонова А.В. Крестьянство на освобожденной территории БССР (сентябрь 1943 – май 1945 гг.): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 2009; Шарков А.В. Содержание и трудовое использование военнопленных и интернированных на территории Беларуси в системе органов внутренних дел (1944–1951): Дис. … д-ра ист. наук. Мн., 1998.

[6] Гл.: Вознесенский Н.А. Военная экономика СССР в период Отечественной войны. М., 1947.

[7] Гл.: Володарский Л. Возрождение районов СССР, пострадавших от немецкой оккупации. М., 1946.

[8] Гл.: Манусевіч А.М., Сосін Л.М. Савецкая Беларусь у новай пяцігодцы. Мн., 1948; Малинин С.Н. Социалистическое народное хозяйство БССР. Мн., 1949; Чорны І.Л. Пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1946–1950 гг. Мн., 1946; Патолічаў Н.С. Справаздачны даклад ЦК КП(б)Б на 20 з'ездзе КП(б)Б. Мн., 1952.

[9] Гл.: Народное хозяйство БССР в 1968 г. Мн., 1969.

[10] Гл.: Экономика Советской Белоруссии 1917–1967 гг. Мн., 1967.

[11] Гл.: Экономическая история БССР / Под общ. ред. С.Н. Малинина, К.И. Шабуни. Мн., 1969.

[12] Гл.: Развитие отраслей народного хозяйства Белоруссии: Историко-географические очерки / Под ред. В.П. Бородиной и др. Мн., 1978.

[13] Гл.: Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 4. Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1938–1945). Мн., 1975; Т. 5. Беларуская ССР у перыяд стварэння развітога сацыялістычнага грамадства і будаўніцтва камунізму (1945–1974). Мн., 1975.

[14] Гл.: Купрэева Г.П. Дапамога савецкага ўрада і працоўных брацкіх рэспублік у аднаўленні народнай гаспадаркі Беларусі (верасень 1943–1945 г.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1972. № 2. С. 13–21; Купреева А.П. Возрождение народного хозяйства Белоруссии 1942–1945 гг. Мн., 1976; Купреева А.П. Народы СССР – трудящимся Белоруссии // Возрождение хозяйственно-экономической жизни республики 1943–1945 гг. Мн., 1981.

[15] Гл.: Лыч Л.М. Аднаўленне і развіццё чыгуначнага транспарту БССР (верасень 1943–1970 гг.). Мн., 1976.

[16] Гл.: Юшкевич Е.П., Березанский В.Ф. Железные дороги Белоруссии во время Великой Отечественной войны. 1941–1945. Мн., 1984.

[17] Гл.: Марченко И.Е. Трудовой подвиг рабочего класса Белорусской ССР. Мн., 1977.

[18] Гл.: Олехнович Г.И. Экономика Беларуси в условиях Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. Мн., 1982.

[19] Гл.: Эканамічная гісторыя Беларусі / Пад агул. рэд. В.І. Галубовіча. 2-е выд., дап. і перапрац. Мн., 1996.

[20] Гл.: Шарков А.В. Архипелаг ГУПВИ на территории Беларуси (1944–1951). Мн., 2003; Ён жа. Военнопленные и интернированные на территории Беларуси. Роль органов внутренних дел в их содержании и использовании 1944–1951 гг. Мн., 1997.

[21] Гл.: Военнопленные, 1941–1956 = Kriegsgefangene. Мн., 2003; Военнопленные в СССР, 1939–1956 гг.: В 5 т. Т. 4. Главное управление по делам военнопленных и интернированных НКВД – МВД СССР. 1941–1952 гг. Волгоград, 2004; Т. 5. Региональные структуры ГУПВИ НКВД – МВД СССР. 1941–1951 гг. Волгоград, 2004.

[22] Гл.: Гладкевич А.И. Организация труда немецких военнопленных на предприятиях и стройках Беларуси // Другая сусветная вайна: новыя аспекты даследаванняў. Мн., 2004. С. 164–181.

[23] Гл.: Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі 1944–1953 гг. Мн., 1997.

[24] Гл.: Великий А. Запретить приводить какие-либо цифры и ссылаться на ЮНРРА // Народная воля. 1996. № 86. С. 4.

[25] Гл.: Бушчык Г.П. Выкарыстанне рэпарацый для аднаўлення гаспадаркі Беларусі пасля Другой сусветнай вайны // XXI век: актуальные проблемы исторической науки. Мн., 2004. С. 237–238; Бушчык Г.П. Міжнародныя пагадненні аб рэпарацыях і іх паступленне ў БССР у 1945–1946 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 2005. № 8. С. 10–15; Бущик Г.П. Минск в межгосударственном сотрудничестве // Гісторыя Мінска. Мн., 2006. С. 449–474.

[26] Гл.: Железная дорога Беларуси: История и современность / Под общ. ред. В.Г. Рахманько. Мн., 2001; Масальский В. Железные дороги Беларуси 1941–1945 гг. // Компас экспедитора и перевозчика. Информационно-аналитический журнал. 2001. № 6. С. 38–43.

[27] Гл.: История транспорта: Учеб. пособие / А.А. Михальченко и др. Гомель, 2008.

[28] Гл.: Рябцева Н.А. Состояние кадров железнодорожников на белорусских магистралях после Великой Отечественной войны // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні. Мн., 2002.

[29] Гл.: Дрозд С.С. Гомсельмаш: ист. очерк. Мн., 1991; Тарасов Е.В., Райский В.Я., Костян С.И. Мелиормаш. Очерки истории Мозырского завода мелиоративных машин. Мн., 1990.

[30] Гл.: Бущик Г.П. Роль германских репараций в формировании современного промышленного облика Минска // Устойчивое развитие современных крупных городов: теория, опыт, проблемы. Мн., 2002. С. 262–267; Бушчык Г.П. Значэнне германскіх рэпарацый для аднаўлення гаспадаркі г. Магілёва і Магілёўскай вобласці пасля Другой сусветнай вайны // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць. Магілёў, 2003. С. 119–127; Вялікая В.А. Дзяржыншчына ў першы пасляваенны 1944 г. // Зборнік студэнцкіх навуковых прац. Мн., 2004. С. 8–9; Грыбко Ю. Мінск пасля нямецкай акупацыі // Материалы ежегодной науч. конф. студентов и магистрантов ун-та: В 4 ч. Мн., 2002. Ч. 1. С. 199–203; Карпук О. Трудовой подвиг молодежи в годы послевоенного восстановления народного хозяйства Гродненщины (1944–1950) // Свежий ветер'98. Гродно, 1998. С. 149–152; Паўловіч Л.А., Малышаў А.Я. Прамысловасць Мінска. Мн., 1972; Синявская Н.И. Социально-экономическое развитие Жабинковского района в 1944–1955 гг. // Трансфармацыя культуры і грамадства Беларускага Палесся: мінулае, сучаснасць, перспектывы. Брэст, 2003. С. 139–142; Скрабіна Л.С. Аднаўленне гаспадаркі ў Буда-Кашалёўскім раёне (1943–1944) // Вызваленне Беларусі ад германскіх акупантаў (восень 1943 – лета 1944 г.). Мн., 2004. С. 179–182.

Паступіў у рэдакцыю 23.11.11.

***Юлія Віктараўна Кірчук*** – аспірантка кафедры новага і навейшага часу гісторыі Беларусі. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар кафедры новага і навейшага часу гісторыі Беларусі У.Ф. Ладысеў.